ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 29 (124) | Субота, 7 кастрычніка 1972 г. | Год выдання 4-ты | Цана 2 кап.

## ТВАЯ ДРУГАЯ ПРАФЕСІЯ

Першакурснік! Вось і збылася твая мара — ты студэнт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Хутка прабягуць 5 гадоў напружнай вучобы — і ты станеш спецыялістам высокай кваліфікацыі: фізікам і матэматыкам, гісторыкам і філолагам, эканамістам і геолагам, біёлагам і выкладчыкам фізічнай культуры.

Але дрэнны той спецыяліст, які ведае толькі сваю галіну, з'яўляецца абмежаваным толькі сваёй прафесіяй. Для чалавека сённяшняга, а тым больш заўтрашняга дня неабходна быць знаўцам і арганізатарам грамадскага жыцця калектыву. Вельмі добра, калі малады інжынер, настаўнік, урач можа выдатна арганізаваць, але і сам прыняць актыўны ўдзел у гуртках мастацкай самадзейнасці, быць першым на бегавой дарожцы, у сектары для скачкоў, выступіць з цікавай лекцыяй перад аўдыторыяй на актуальныя грамадска-палітычныя тэмы.

Каб стаць менавіта такім шырока адукаваным спецыялістам, у нас, ва універсітэце, ёсць усе ўмовы. З 1 кастрычніка пачаў працаваць універсітэт грамадскіх прафесій, які дае магчымасць пашырыць свой кругагляд і ўдасканаліць майстэрства ў розных галінах грамадскай дзейнасці. На яго аддзяленнях працуюць школа маладога лектара, клуб мастацкай самадзейнасці, секцыі па падрыхтоўцы спартыўных суддзяў і інструктараў па спорту, секцыі па ваенна-тэхнічных відах спорту, дружына па ахове прыроды, студыя выяўленчага мастацтва.

У школе маладога лектара ты зможаш удасканаліць сваё лектарскае майстэрства ў адной з 4 секцый: грамадска-палітычнай, эканамічнай, атэістычнай і секцыі прыродазнаўчых навук. У час навучання слухачы будуць выступаць перад рабочымі прадпрыемстваў, калгаснікамі з сваімі лекцыямі. Выпускнікі атрымліваюць пасведчанне і працягваюць свой лектарскі шлях пры гарадскім таварыстве ведаў.

Калі ты абярэш мастацкую самадзейнасць — клуб яе дапаможа табе стаць акцёрам тэатра мініяцюр, удзельнікам танцавальнага калектыву, хору, эстраднага і духавога аркестраў, вакальнай групы і вакальна-інструментальнага ансамбля. Хоць клуб мастацкай самадзейнасці параўнальна малады, але ёсць ужо і поспехі. Так, вакальна-інструментальны ансамбль «Радзімічы» і танцавальны калектыў сталі дыпламантамі Усесаюзнай універсіяды «Харкаў-72».

Па ваенна-тэхнічных відах спорту ты зможаш займацца ў парашутнай, радыё, секцыях марскога шматбор'я, падводнага плавання, стралковай і мотагуртку.

Калі ты выбраў сабе другую прафесію, то, калі ласка, да нас, ва універсітэт грамадскіх прафесій. Заявы прымаюцца ў камітэце камсамола.

КАМІТЭТ ЛКСМБ.

## У КАМІТЭЦЕ ЛКСМБ

2 кастрычніка адбылося пасяджэнне камітэта камсамола нашага універсітэта. На ім разгледжана арганізацыйнае пытанне.

Па прапанове першага сакратара Чыгуначнага РК ЛКСМБ тав. П. А. Санковіча на пасаду сакратара камітэта камсамола універсітэта была выбрана Тамара Іванаўна ІЛЬЯНКОВА.

Намеснікамі сакратара камітэта камсамола абраны: па ідэалагічнай рабоце Яніна Аляксандраўна ЛЯЛЬКОВА, па навуковай рабоце Яўгеній Мікалаевіч БАБІЧАЎ.

## З ПЕСНЯЙ ПРАЦА СПОРЫЦЦА

У нашым калгасе «Рассвет» на ўборцы бульбы працавалі студэнты ГДУ. І добра сябе зарэкамендавалі — штодзённыя заданні рабяты выконвалі на 108-110 працэнтаў.

Але не толькі ўдарнай працай пакінулі аб сабе памяць юнакі і дзяўчаты ў сельскіх працаўнікоў. Надыходзіў вечар — і іх звонкія галасы гучалі са сцэны клуба — студэнты выконвалі песні, вершы, жарты. Доўга апладыравалі калгаснікі выканаўчаму майстэрству П. Гаевай, Т. Гармаш, Т. Тучынскай, В. Ермалаевай і іншых.

З песняй спорылася праца ў рабят.

І. ЖЛОБА,
загадчык Высокаўскага сельскага клуба
Кармянскага раёна.



Кожную раніцу да універсітэцкіх карпусоў спяшаецца студэнцкая моладзь. У адной плыні крочаць і ўчарашні школьнік, і ветэран-пяцікурснік.

З адным імкненнем ідуць яны ў аўдыторыі — атрымаць новыя веды.

**НА ЗДЫМКУ:** перад пачаткам заняткаў у галоўным корпусе універсітэта.

ДНІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ НА УКРАІНЕ

## НА ЗЯМЛІ КАБЗАРОВАЙ

Кажуць, што дружба не мае межаў, што сэрцы людскія здольныя любіць не толькі сваю зямлю, на якой нарадзіўся, але і зямлю сяброў, дзе ўсё становіцца родным і блізкім. Такой зямлёй была для нас братняя Украіна, дзе цэлы тыдзень, з 25 па 30 верасня, праходзілі дні беларускай літаратуры. У гэтым свяце нашай літаратуры разам з мінскімі паэтамі Станіславам Шушкевічам, Рыгорам Няхаем, Казімірам Камейшам і Хведарам Чэрняй давялося прымаць удзел і мне.

Успамінаючы кожны дзень знаходжання на зямлі суседзяў, зноў і зноў нібы вяртаешся да гасцінных і шчодрых братоў-украінцаў...

Чарнігаў сустрэў абдымкамі, усмешкамі соцень вачэй і духмяным, вялізным караваем на вышываным ручніку. Пасля прыёму ў абласным камітэце партыі пачалося наша знаёмства з горадам. Чарнігаў — адзін са старажытнейшых гарадоў славянства, багаты сваім мінулым і сённяшнім. На плошчах і вуліцах шмат помнікаў старажытнасці, з вялікай любоўю гараджане ўшаноўваюць памяць аб загінуўшых у барацьбе за Савецкую ўладу ў гады грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Ва ўсім гэтым давялося пераканацца ўваччавідкі. Адначасова са знаёмствам з горадам былі і выступленні на прадпрыемствах.

Два дні — нядзеля і панядзелак — прайшлі ў Чарнігаве, астатнія — у вобласці.

Для таго, каб як мага больш людзей маглі ўбачыць літаратараў з Беларусі, пачуць іх жывое слова, былі створаны тры брыгады, распрацаваны адпаведныя маршруты па вобласці. Разам з беларускімі пісьменнікамі ў гэтых выступленнях перад працоўнымі Чарнігаўшчыны прымалі ўдзел і ўкраінскія літаратары Леанід Горлач, Алесь Жолдак, Раман Іванійчук, Станіслаў Рэп'ях.

Маршрут нашай брыгады быў наступны: Чарнігаў — Нежын — Ічня — Прылукі — Срыбне — Чарнігаў. Мы выехалі ўчатырох: Рыгор Няхай, Леанід Горлач, Станіслаў Рэп'ях і я. Адразу ж за горадам пачаліся шырокія палі, багатыя паўночныя чарназёмы Украіны. Наш сябра — чарнігаўскі паэт Станіслаў Рэп'ях — быў сапраўднай «дарожнай энцыклапедыяй». На ўсім шляху ён расказваў аб славутых людзях, якія нарадзіліся ў той альбо іншай праезджай вёсачцы.

(Заканчэнне на стар. 2)

# У СУЗОР'І БРАТНІХ РЭСПУБЛІК

## Літоўская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка

«Канцэнтрацыя матэрыяльных сродкаў і намаганняў, бескарыслівая ўзаемная дапамога савецкіх народаў дазволілі стварыць ва ўсіх рэспубліках высокаразвітую прамысловасць і буйную механізаваную сельскую гаспадарку».

(З пастановы ЦК КПСС «Аб падрыхтоўцы да 50-годдзя ўтварэння СССР»).

Літоўскаму народу не суджана было прайсці ў сям'і народаў-братоў увесь 50-гадовы шлях стваральнай працы і перамог. Савецкая ўлада была абвешчана ў рэспубліцы ў 1918—1919 гг. Але мясцовай контррэвалюцыі з дапамогай імперыялістаў Захаду ўдалося патапіць у крыві ўладу рабочых і сялян. Больш дваццаці год працягвалася засілле рэакцыі. Аднак ёй не ўдалося зламіць рэвалюцыйны дух працоўнага народа. Пад кіраўніцтвам загартаванай у баях Кампартыі Літвы ён дабіўся ў 1940 годзе ажыццяўлення сваёй мары—жыць дастойным жыццём, ісці па шляху свабоды і прагрэсу.

Суровай праверкай былі гады Вялікай Айчыннай вайны. У радах Савецкай Арміі і ў партызанскіх атрадах змагаліся многія тысячы літоўцаў. Разам з іншымі савецкімі народамі яны радасна святкавалі Дзень Перамогі над гітлераўскай Германіяй.

У пасляваенныя гады ў Савецкай Літве была створана магутная будаўнічая база. Узніклі новыя галіны прамысловасці. Нязмерна павысіўся жыццёвы ўзровень народа.

Нацыянальны даход рэспублікі ў мінулым годзе склаў амаль 4,5 млрд. рублёў. Тры чвэрці яго выдзелена на спажыванне. У сувязі з ростам пакупніцкай здольнасці насельніцтва рэзка вырасла сфера абслугоўвання, асабліва гандаль і служба быту.

Дзе аграрная Літва ўзяла б абсталяванне для двухсот буйных прамысловых прадпрыемстваў, якія ўзведзены ў пасляваенныя гады? Вось, напрыклад, адно з іх—Літоўская ДРЭС, якая адыграла выключную ролю ў электрыфікацыі народнай гаспадаркі. На гэту электрастанцыю, пакуль яна будавалася, працавалі сотні прадпрыемстваў амаль усіх саюзных рэспублік. Хімічная прамысловасць Літвы аснашчана абсталяваннем, атрыманым з Масквы, Ленінграда, Кіева, Ерэвана; буйнейшы ў Літве Алітускі баваўняны камбінат атрымаў машыны з РСФСР, Узбекістана і Таджыкістана. У Каўнасе выдатна зарэкамендавалі сябе машыны для прадзення дыацэтатнага шоўку з Пскова...

У сваю чаргу Літва адпраўляе ў братнія рэспублікі складаныя станкі і прыборы, веласіпеды і штучнае валакно, тканіны, трыкатаж і швейныя вырабы, мясныя і малочныя прадукты, рыбу.



Сталіца Літоўскай ССР — Вільнюс. Вуліца Караліса Пажэла.

## «Нібы галіны магутнага дрэва»...

У Акадэміі навук Літоўскай ССР — сорак чатыры акадэмікі і члены-карэспандэнты. Прэзідэнт Акадэміі навук Ю. Ю. Матуліс у гутарцы з карэспандэнтам ТАСС адзначыў, што пераважная большасць з іх — выхаванцы савецкай школы.

— За 26 пасляваенных год, — працягваў вучоны,— нам удалося разгарнуць глыбокія даследаванні, стварыць арыгінальныя навуковыя школы. Літоўскія вучоныя ніколі не забываюць, што гэта стала магчымым толькі дзякуючы творчаму ўзаемадзеянню з навуковымі ўстановамі ўсёй краіны і перш за ўсё з інстытутамі Акадэміі навук СССР.

Ю. Ю. Матуліс з'яўляецца адным з буйнейшых у свеце спецыялістаў па электрахіміі. Неаднаразова ўзначальваў ён савецкія дэлегацыі на міжнародных кангрэсах. Ён захоплена расказвае аб тым, як вучоныя Савецкай Літвы імкнуцца ўнесці свой уклад у развіццё навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Напрыклад, моцная група літоўскіх вучоных-кібернетыкаў, якія працуюць у цесным кантакце са сваімі калегамі з Расійскай Федэрацыі, Украіны і Грузіі, даследвае праблемы апазнапня гукавых сігналаў. Ёсць надзея, што ў бліжэйшы час будуць створаны электронна-вылічальныя машыны, здольныя выконваць галасавыя каманды чалавека.

— Найшырэйшыя магчымасці адкрыліся перад Літвой у сям'і братніх рэспублік,—гаворыць у заключэнне Ю. Ю. Матуліс.—Усе нашы народы—нібы галіны аднаго магутнага дрэва. Імя гэтаму волату—СССР.

### ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

Літоўская ССР займае плошчу 65,2 тыс. квадратных кіламетраў. Насельніцтва рэспублікі —3.200 тысяч чалавек.

●

Аб'ём прамысловай прадукцыі рэспублікі ў 34 разы перавышае ўзровень 1940 года. Выпрацоўка электраэнергіі за гады Савецкай улады павялічылася больш чым у 90 разоў.

●

У рэспубліцы ствараецца яшчэ адна галіна — нафтаперапрацоўчая. У канцы пяцігодкі павінна ўвайсці ў строй першая чарга завода ў Мажэйкяй, які будзе працаваць на паступаючай па трубаправоду сыравіне.

●

За бягучую пяцігодку ў рэспубліцы будзе асушана яшчэ 750 тыс. гектараў пераўвільготненых і забалочаных зямель.

●

У параўнанні з 1940 годам у Літоўскай ССР амаль у 4 разы вырас гадавы тыраж кніг. Газет стала больш у 16 разоў.

●

У мінулым годзе ў Літоўскай ССР на кожных 100 гектарах сельскагаспадарчых угоддзяў было атрымана па 156 цэнтнераў мяса ў жывой вазе і па 714 цэнтнераў малака. Нягледзячы на вельмі неспрыяльныя ўмовы надвор'я ў 1971 годзе, атрымана збожжавых з гектара па 24,6 цэнтнера на круг.

●

У народнай гаспадарцы рэспублікі працуе каля 210 тысяч спецыялістаў вышэйшай і сярэдняй кваліфікацыі.

# ПЕРАЎТВОРАНАЯ ЗЯМЛЯ

Правіцелі буржуазнай Літвы хваліліся, што ў распараджэнні памешчыкаў і кулакоў знаходзіцца каля 400 трактараў. Цяпер «жалезных коней» у рэспубліцы ў сто разоў больш, а ў бягучым пяцігоддзі іх колькасць павялічыцца яшчэ на 27.500.

Літву іншы раз называюць краем тысячы азёр. Але за гэтым гучным імем хаваецца і іншае: больш 40 працэнтаў зямель у рэспубліцы залішне вільготныя і балоцістыя. На працягу вякоў сяляне вялі ўпартую барацьбу з балотамі. Вось чаму ў гады Савецкай улады быў разгорнут шырокі фронт меліярацыйных работ. Сельская гаспадарка Літвы ўжо атрымала 1,3 мільёна гектараў спрыяльных для выкарыстання зямель, і барацьба за ворыўныя землі працягваецца з неаслабнай сілай.

Вялікая ўвага ў рэспубліцы ўдзяляецца перабудове атрыманага ў спадчыну ад буржуазнага ладу хутарскога рассялення сельскіх жыхароў. Гэта сістэма супярэчыць прынцыпам вядзення буйной сацыялістычнай гаспадаркі, перашкаджае стварэнню сучасных умоў для працы, быту і адпачынку сельскіх працаўнікоў. Цяпер на змену раскіданым хутарам прыходзяць добраўпарадкаваныя пасёлкі калгасаў і саўгасаў. Архітэктары рэспублікі шмат робяць, каб літоўскую зямлю ўпрыгожылі населеныя пункты, дастойныя нашага сацыялістычнага сёння і камуністычнага заўтра. Не выпадкова, што ў мінулым годзе аўтары праекта і будаўнікі пасёлка Дайнава былі ўдастоены Дзяржаўнай прэміі СССР.

Вялікія задачы трэба вырашаць калгаснікам і рабочым саўгасаў Літоўскай ССР у бягучай пяцігодцы. Яны намецілі давесці ў 1975 годзе ўраджайнасць збожжавых культур да 30 цэнтнераў з гектара, а сярэдні надой малака з адной каровы да 3.300—3.500 кілаграмаў. Намячаецца таксама значнае развіццё кармавой базы жывёлагадоўлі.



На Каўнаскім радыёзаводзе вялікім аўтарытэтам у моладзі карыстаецца мантажніца цэха дробных серый Герой Сацыялістычнай Працы камуністка Генавайтэ Пушынскайтэ. Кадравая работніца пастаянна імкнецца перадаваць свой багаты вытворчы вопыт маладым работнікам вытворчасці.

Вытворчую дзейнасць Пушынскайтэ паспяхова спалучае з грамадскай работай. Яна — член парткома завода і дэпутат Каўнаскага гарсавета.

**На здымку:** Г. Пушынскайтэ (другая злева) паказвае прыёмы работы маладым работніцам В. Залецкітэ, Р. Янкаўскайтэ і Э. Радзевічутэ.

**Здымкі фотахронікі ТАСС.**

# ПА ЗАКОНУ ДРУЖБЫ

Партыю агрэгатаў для прыгатавання вітамінная травяной мукі адправіла ў Паўночна-Асецінскую АССР вільнюская фірма «Нерыс». Гэты заказ каўказскіх сяброў літоўскія машынабудаўнікі выканалі датэрмінова.

Фірма «Нерыс» забяспечвае ўсе братнія рэспублікі высокапрадукцыйнымі агрэгатамі.

На ўскраіне маладога літоўскага горада Электранай узняліся высока ў неба трубы Літоўскай ДРЭС імя У. І. Леніна. Яна забяспечвае многія прамысловыя прадпрыемствы рэспублікі, гарады і сельскую мясцовасць дзяшовай электраэнергіяй.

Цяпер на ДРЭС поўным ходам ідзе мантаж апошняга, восьмага энергаблоку, магутнасцю 300 тысяч кілават. Па-ўдарнаму працуюць тут рабочыя многіх нацыянальнасцей краіны. Апошні энергаблок яны абавязаліся ўвесці ў строй дзеючых у бягучым годзе. Гэта іх падарунак слаўнаму юбілею — 50-годдзю ўтварэння СССР.



**На здымку:** будаўнікі станцыі ўдарнікі камуністычнай працы (злева направа) літовец І. М. Каўшас, рускі Н. М. Карчагін і літовец С. І. Юркявічус.

